СПбПУ проводит ежеквартально методические семинары для учителей физики на базе учебной физической лаборатории;

в) сетевые образовательные платформы.

Школьники имеют доступ к 66 курсам на платформе «Открытое образование», созданным преподавателями политехнического университета.

Физика перестает быть «страшным» предметом, когда ученик держит в руках деталь, созданную по ее законам.

Расскажем о программе «Физические исследования» (СПбПУ), на которую может записаться любой школьник Ленинградской области. Разработана и проводится под руководством преподавателей политехнического университета. Она состоит из семи тематических модулей (механика, оптика, электричество и др.) и проводится в смешанном формате (12 ч дистанционной теории и 30 ч практики на реальном оборудовании). Так, модуль «Приборный практикум» знакомит школьников с различными методами измерения физических величин. С 2023–2025 гг. 800 школьников Ленобласти прошли обучение и освоили работу с приборами. Опыт реализации данной модели доказывает, что сетевое сотрудничество «школа – вуз – промышленность»:

1) формирует инженерную мотивацию через решение реальных задач;

2) повышает интерес к физике за счет ее прикладной ценности.

В завершение следует отметить, что сетевое сотрудничество технического вуза с региональными школами в рамках пропедевтики инженерного образования – это:

– социальный лифт для талантливой молодежи из регионов;

– мост между теорией и практикой, где задачи решаются для реального сектора экономики;

– инструмент технологического суверенитета, готовящий кадры для прорывных проектов (импортозамещение, цифровизация промышленности).

Инженерное образование начинается не в вузе, а в школьной лаборатории. Модель Санкт-Петербургского политехнического университета это доказывает.

## КОМПЛЕКСНАЯ СІСТЭМА АДМІНІСТРАВАННЯ АФІЦЫЙНАГА РЭСПУБЛІКАНСКАГА САЙТА «АБІТУРЫЕНТ»

**Ю. В. Крышнёў**

*Установа адукацыі «Гомельскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт імя П. В. Сухога», Рэспубліка Беларусь*

АБІТУРЫЕНТ.by (http://abiturient.by) – афіцыйны рэспубліканскі Web-сайт, прызначаны для прадастаўлення даведачнай і метадычнай інфармацыі па пытаннях паступлення ва ўстановы вышэйшай адукацыі (УВА) Рэспублікі Беларусь. Сайт быў распрацаваны спецыялістамі ўстановы адукацыі «Гомельскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт імя П. В. Сухога», дзяржаўнай установы адукацыі «Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы» пад агульным кіраўніцтвам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

*Мал. 1.* Лагатып праекта АБІТУРЫЕНТ.by

У працэсе праектавання стала відавочным, што найбольш дасканалым спосабам падтрымання працаздольнасці і актуальнасці даных сайта з'яўляецца распрацўка і выкарыстанне так званага адміністратарскага інтэрфейса – часткі сістэмы АБІТУРЫЕНТ.by з абмежаваным доступам для кіравання інфармацыяй, прызначанай для прадстаўнікоў УВА. У распрацаванай сістэме ад кожнай навучальнай установы на сайце павінен быць зарэгістраваны адказны прадстаўнік – асоба, адказная за прадастаўленне і рэдагаванне інфармацыі аб УВА, прадстаўніком якой яна з'яўляецца. Для кожнага прадстаўніка УВА прадугледжана магчымасць службовага ўваходу ў адміністратарскі інтэрфейс (мал. 2).




*Мал. 2.* Форма аўтарызацыі прадстаўніка УВА на сайце

Агульны выгляд галоўнай стронкі адміністратарскага інтэрфейса кіравання праектам АБІТУРЫЕНТ.by на баку УВА прадстаўлены на мал. 3, а выгляд меню «Адміністраванне» – на мал. 4. Меню галоўнай старонкі забяспечвае доступ прадстаўніка УВА да ўсіх асноўных інфармацыйных раздзелаў, неабходных для запаўнення інфармацыі, цікавай для абітурыентаў навучальнай установы. Пры гэтым інфармацыя кожнай УВА прадстаўлена ў аднастайным выглядзе, што гарантуе аб'ектыўнасць параўнання абітурыентамі асноўных аспектаў работы УВА, звязаных з арганізацыяй прыёма і якасцю аказання адукацыйных паслуг кожнай навучальнай установай.




*Мал. 3.* Выгляд галоўнай старонкі адміністратарскага інтэрфейса сайта




*Мал. 4.* Агульны выгляд адміністратарскага інтэрфейса:
*1* – прывітальны надпіс з указаннем імя і прозвішча карыстальніка (прадстаўніка навучальнай установы); *2* – меню «Адміністраванне» – змяшчае спасылкі на асноўныя працоўныя функцыі для прадстаўніка навучальнай установы

У якасці прыкладаў разгледзім некалькі функцыянальных раздзелаў, якія запаўняюцца адказнымі прадстаўнікамі УВА.

**Змяненне агульнай інфармацыі аб установе адукацыі.** На дадзенай старонцы рэдагуецца інфармацыя аб установе адукацыі. Выгляд старонкі прадстаўлены на мал. 5.




*Мал. 5.* Выгляд старонкі рэдагавання інфармацыі аб установе адукацыі

Для зручнасці ўводу інфармацыі усе параметры падзелены на некалькі ўкладак:

- Галоўнае.
- Кіраўнік УВА.
- Дакументы.
- Фотаздымкі.
- Інфармацыя для студэнтаў.
- English Version.

Ва ўкладцы «Галоўнае» (мал. 5) можна змяніць наступную інфармацыю: назву ўстановы адукацыі; тып уласнасці; горад; спасылка на маніторынг; дата заснавання; ліцэнзія; адрас; праезд; тэлефон; факс; Web-сайт; E-mail; спасылкі на сацыяльныя сеткі.

Ва ўкладцы «Кіраўнік УВА» (мал. 6) можна змяніць наступную інфармацыю: ПІБ кіраўніка УВА, яго вучоную ступень і званне, а таксама загрузіць фатаграфію. Для прымянення змяненняў неабходна на завяршэнне работы з кожным раздзелам націскаць кнопку «Захаваць».




*Мал. 6.* Выгляд укладкі «Кіраўнік УВА»

Укладка «Дакументы» змяшчае прымацаваныя дакументы. Прадстаўнік навучальнай установы мае магчымасць загрузіць на сайт «АБІТУРЫЕНТ.by» наступныя дакументы:

– парадак прыёму ва УВА на бягучы год;

– парадак прыёму на ваенны факультэт (пры яго наяўнасці) на бягучы год;

– інфармацыю аб конкурсе і прахадным бале на спецыяльнасці дзённай бюджэтнай формы навучання за 2006, 2007, 2008, 2009 і 2010 гады (інфармацыя аб прахадным бале за 2011–2024 гады ўводзіцца ў спецыяльную форму на сайце);

– інфармацыю прыёмнай камісіі бягучага года прыёму (у выглядзе адвольнай колькасці файлаў, інфармацыя ў кожным з якіх асвятляе пэўны аспект уступнай кампаніі ва УВА: праграмы ўступных іспытаў, графікі работы падрыхтоўчых курсаў, расклад уступных экзаменаў, загады аб залічэнні па розных формах навучання і г. д.).

Ва ўкладцы «Фатаграфіі» (мал. 7) можна кіраваць фатаграфіямі УВА. Для загрузкі выявы неабходна націснуць кнопку «Абярыце файл», абраць файл на дыску камп’ютара, і націснуць на кнопку «Загрузіць».




*Мал. 7.* Выгляд укладкі «Фатаграфіі»

Ва ўкладцы «Інфармацыя для студэнтаў» мэтазгодна размяшчаць тэкставую інфармацыю аб умовах пражывання іншагародніх студэнтаў, прадстаўленую ў сціснутай і ёмістай форме, інфармацыю аб штогадовых конкурсах, канферэнцыях, стартапах і ншых мерапрыемствах.

**Кіраванне факультэтамі.** Дадзеная старонка прызначана для кіравання структурай факультэтаў УВА і дае наступныя магчымасці (мал. 8):

– кіраванне пералікам факультэтаў (дадаванне, выдаленне, перайменаванне), а таксама падрабязнай інфармацыяй аб іх;

– кіраванне пералікам выпускаючых кафедр;

– дадаванне спецыяльнасцей да факультэта;

– кіраванне інфармацыяй аб спецыяльнасцях, па якіх праводзіцца навучанне ва УВА.




*Мал. 8.* Агульны выгляд старонкі кіравання інфармацыяй факультэтаў

Для доступу да старонкі «Кіраванне інфармацыяй факультэта» неабходна насупраць назвы факультэта абраць опцыю «Змяніць». Далей можна кіраваць наступнай інфармацыяй: назва факультэта; інфармацыя аб дэкане (ПІБ, вучоная ступень, званне, фатаграфія); № кабінета; тэлефон; факс; адрас; праезд; Web-сайт, E-mail, якія выпускаюць кафедры. У раздзеле «Дадатковая інфармацыя» можна размясціць тэкставую інфармацыю аб факультэце (аб’ём – не менш за 500 знакаў і не больш за 5000 знакаў) і фатаграфіі. Прыклад запаўнення інфармацыі факультэта можна прагледзець на старонцы http://abiturient.by/university/gstu/faculty/11514.html.

Аналагічным чынам праз адміністратарскі інтэрфейс сайта можна кіраваць і іншымі раздзеламі на баку ўстановы вышэйшай адукацыі:

- План прыёму.
- Кошт навучання.
- Кіраванне кафедрамі.
- Паказчыкі навуковай работы кафедр.
- Сувязі кафедр з прадпрыемствамі.
- Тэмы курсаў павышэння кваліфікацыі.
- Прахадны бал па спецыяльнасцях за год, які папярэднічае году паступлення.
- Характарыстыка УВА для замежных абітурыентаў.

Вышэйапісаны механізм рэалізацыі комплекснай сістэмы адміністравання афіцыйнага рэспубліканскага сайта «АБІТУРЫЕНТ.by» дазваляе пры дапамозе адказных прадстаўнікоў УВА ў аднастайнай і кампактнай форме прадстаўляць дастаткова вялікі аб’ём актуальнай інфармацыі абітурыентам Беларусі.